Сярод фактараў, якімі дэтэрмінаваны рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці, вылучым наступныя: аб'ектыўныя і суб'ектыўныя. Да аб'ектыўных мы адносім: геаграфічнае акружэнне, эканамічныя і сацыяльныя ўмовы, вытворчасць, навуковую спецыялізацыю, а таксама гістарычныя, культурныя, інтэлектуальныя асаблівасці, нацыянальныя, бытавыя і іншыя ўмовы канкрэтна-гістарычных супольнасцей. Да суб'ектыўных фактараў, якія адлюстроўваюць спецыфічнае ў рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцях, можна аднесці: асаблівасці структуры і ступень падрыхтоўкі кадраў, якія займаюцца рэгіянальнымі праблемамі; якасць і характар працы спецыялістаў. Пераважную ролю ў фарміраванні рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей асобы адыгрываюць унутраныя пабуджальныя сілы: настрой, перажыванне, асаблівасці псіхічнага складу, матывы, установкі і інш., а ў іх узнікненні — культурныя традыцыі канкрэтна-гістарычных супольнасцей людзей.

**Карасцінская Н.У.,**
*аспірантка кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ І.Б.СІМАНОЎСКАГА НА СТРУКТУРУ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Тэарэтычныя погляды І.Б.Сіманоўскага на беларускую бібліяграфію нельга вывучаць без разгляду яго ўяўленняў аб беларускай бібліяграфіі цалкам як грамадскай з'явы.

Прафесійная дзейнасць Сіманоўскага пачыналася ў 20-я гады нашага стагоддзя, і яго тэарэтычныя погляды складваліся менавіта пад уплывам кнігазнаўчай парадыгмы, якая існавала ў той час у бібліяграфіі. Але ў межах гэтай тэорыі склалася некалькі падыходаў да вызначэння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статусу бібліяграфіі. Два з іх можна вылучыць у якасці асноўных. Адны вучоныя сцвярджалі, што бібліяграфія з'яўляецца самастойнай навуковай дысцыплінай у межах кнігазнаўства. Да іх належалі Я.Грэбеншчыкоў, М.Куфаеў, А.Лавягін, Н.Лясоўскі. Іншыя, напрыклад М.Здабноў, І.Ульянінскі, таксама адносілі бібліяграфію да навук, але лічылі, што яна з'яўляецца дапаможнай кнігазнаўчай дысцыплінай. Так, М.Здабноў выказваў думку, што яшчэ не было дастаткова пераканаўчых доказаў, каб прызнаць бібліяграфію самастойнай навукай. Пазней прыхільнікамі бібліяграфіі як усеагульнай дапаможнай навукі або навуковай дысцыпліны з'явіліся М.Брыскман і Д.Цяплоў.

Сімаўскі належаў да другога напрамку кнігазнаўчага падыходу да бібліяграфіі як навукі. Не надаючы ёй статусу самастойнай навукі, ён прызнаваў, што з цягам часу бібліяграфія "дыферэнцыруецца" (інакш кажучы, стане самастойнай навуковай дысцыплінай), але ў сучасны момант вылучэнне яе ў такой якасці лічыў не мэтазгодным. У выступленні на І Усерасійскім бібліяграфічным з'ездзе (1924 г.) Сімаўскі зводзіў сутнасць бібліяграфіі да адзінага метаду, які трактаваў вельмі шырока — як асноўны метад кнігазнаўства, навуковага бібліятэказнаўства і практычнай бібліятэчнай справы, а таксама выкладчыцкай і даследчай дзейнасці, і яшчэ шырэй — як метад арганізацыі інтэлектуальнай працы.

У 20—30-я гг. шмат увагі надавалася абмеркаванню праблем навуковай бібліятэкі, якая б найбольш эфектыўна задавальняла патрэбы навукова-даследчай дзейнасці. Прапанова Сімаўскага аб укараненні бібліяграфічнага метаду ў практыку работы навуковых бібліятэк, што дало б магчымасць зрабіць іх актыўнымі навуковымі ўстановамі, была прынцыпова новай, і менавіта па гэтым шляху пачала развівацца бібліятэчная справа ў Беларусі і іншых краінах былога СССР. Гэта была самая анталагічна шырокая трактоўка бібліяграфічнага метаду. У 60—70-х гг. у працах Ю.Зубава, С.Трубнікава, Ю.Тугава, А.Чубар'яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічны метад разглядаўся толькі адносна рэкамендацыйнай бібліяграфіі. У 80-я гг. М.Вохрышава ў сваіх працах робіць спробу даказаць, што бібліяграфічныя метады па сваёй сутнасці з'яўляюцца агульнанавуковымі. Больш падрабязна навукова абгрунтаваная канцэпцыя бібліяграфіі як метаду разглядалася ў дысертацыйным даследаванні Н.Сляднёвай "Бібліяграфія ва універсуме чалавечай дзейнасці". Н.Сляднева лічыць бібліяграфічны метад універсальным для ўсіх сфер чалавечай дзейнасці. Аднак аўтар не зводзіць сутнасць бібліяграфіі да метаду; гэта, на яе думку, перш-наперш навука, канчатковай мэтай якой з'яўляецца стварэнне метадычных ведаў. Нягледзячы на разнастайныя адценні ў вучэнні аб бібліяграфічным метадзе, пачатак распрацоўкі гэтай праблемы, бясспрэчна, належыць Сіманоўскаму.

Да аб'екта бібліяграфіі Сіманоўскі адносіў не толькі ўласна кнігі, але і картаграфічныя, нотныя выданні, матэрыялы выяўленчага мастацтва, аўдыёвізуальныя дакументы, а таксама іншыя друкаваныя выданні і матэрыялы (рэцэнзіі, артыкулы і г.д.). Аб гэтым сведчыць тое, што ў плане-праспекце стварэння нацыянальных рэтраспектыўных паказальнікаў, які былі падрыхтаваны яшчэ ў 20-я гг. і ў якім непасрэдны ўдзел прымаў Сіманоўскі, першы том планавалася прысвяціць апісанню рукапіснай і друкаванай беларускай кнігі з пачатку яе зараджэння. Акрамя таго, ужо значна пазней у сваёй манаграфіі ён даследуе развіццё бібліяграфавання рукапісаў і дысертацый і бачыць пэўныя перспектывы па іх удасканаленні.

Такім чынам, уяўленне Сіманоўскага аб аб'екце бібліяграфіі для таго часу было прагрэсіўным і прадбачлівым. Па сутнасці, тут ён быў бліжэй да дакументазнаўчага падыходу.

Ад сутнасці бібліяграфіі і яе аб'екта ў значнай ступені залежаць функцыі, якія яна выконвае ў грамадстве. У сваёй манаграфіі Сіманоўскі выдзяляе такія функцыі бібліяграфіі, як інфармацыйная, пошукавая, кансультацыйная,

палітыка-асветніцкая, навукова-дапаможная і крыніцазнаўчая (гл.: Белорусская советская библиография. Ч. 1/ Гос. б-ка БССР им. В.И.Ленина. Кн. палата БССР.— Мн., 1965.— 191 с.). Калі параўнаць гэтую структуру з існаваўшымі ў той час поглядамі іншых вучоных, то можна ўбачыць, што некаторыя функцыі адзначаны Сіманоўскім упершыню, напрыклад кансультацыйная і крыніцазнаўчая.

Адным з галоўных кампанентаў бібліяграфічнай дзейнасці з'яўляюцца яе вынікі. Уяўленні Сіманоўскага аб выніках бібліяграфічнай практычнай дзейнасці былі дваістымі. З аднаго боку, ён, зыходзячы з сутнасці бібліяграфіі як ужывання бібліяграфічнага метаду, разумеў пад вынікам бібліяграфічнай дзейнасці метадычныя веды. З другога — мабыць, пад уплывам інфармацыйна-камунікатыўнай парадыгмы, што нараджалася ў той час у бібліяграфіі, ён сцвярджаў, што яе вынікам з'яўляюцца бібліяграфічныя дапаможнікі.

Гэта не зусім адпавядала меркаванням іншых вучоных. М.Куфаеў, А.Лавягін, М.Здабноў пад вынікам бібліяграфіі разумелі веданне кніг. Пазней аналагічныя думкі выказваў адзін з вядомых амерыканскіх вучоных у галіне бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства Д.Х.Шыра. Займаючыся распрацоўкай сацыяльнай эпістэмалогіі як метасістэмы бібліяграфазнаўства, ён лічыў, што вынікам бібліяграфічнай дзейнасці з'яўляюцца веды аб кнігах.

Вынік бібліяграфічнай дзейнасці ў кожны час існавання разнастайных парадыгм разглядаўся па-рознаму. Прыхільнікі сацыяльна-кіраўнічай (каштоўнасна арыентацыйнай) парадыгмы (Н.Крупская, Л.Трапоўскі, І.Уладзіслаўлеў), якая прыйшла на змену кнігазнаўчай, лічылі вынікам бібліяграфічнай дзейнасці ўздзеянне на светапогляд чалавека, на павышэнне эфектыўнасці яго працы ў розных галінах грамадскай вытворчасці (праз выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі як прадукта "дапаможнай навукі бібліяграфіі").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узнікае пытанне, ці правамерныя высновы Сімаполускага аб мностве вынікаў бібліяграфіі. Каб адказаць на яго, звернемся да сучасных поглядаў у гэтай галіне. Апошнія даследаванні сведчаць, што вынікі бібліяграфічнай дзейнасці з'яўляюцца шматузроўневымі і іерархічнымі. Так, М.Вохрышава, зыходзячы з інфармацыйнакамунікатыўнага падыходу да бібліяграфіі, абгрунтавала трохузроўневую мадэль вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці. Першы ўзровень яна звязвае з узаемадзеяннем бібліёграфа з дакументам (працэс бібліяграфавання), вынікам якога з'яўляецца бібліяграфічная інфармацыя. Другі ўзровень звязаны з узаемадзеяннем карыстальніка з бібліяграфічнай інфармацыяй (працэс бібліяграфічнага абслугоўвання). Яго вынік — задавальненне патрэб у бібліяграфічнай інфармацыі. У якасці трэцяга ўзроўню, паводле канцэпцыі М.Вохрышавай, выступае задавальненне патрэб у дакументах пры выкарыстанні бібліяграфічнай інфармацыі. Вынікі першых двух узроўняў яна адносіць да прамежкавых (працэсуальных), а вынік трэцяга ўзроўню лічыць сукупным (канчатковым).

Іншую пазіцыю па гэтай праблеме адстойвае Н.Сляднева. Яна, у адрозненне ад М.Вохрышавай, да канчатковага выніку бібліяграфіі адносіць не задавальненне патрэб у дакументах, а метадычныя веды. І ўвогуле ўсю бібліяграфічную дзейнасць разглядае ў метадычнай інфраструктуры універсуму чалавечай дзейнасці.

У кантэксце нашага даследавання аб выніках бібліяграфіі асаблівую цікавасць уяўляе манаграфія В.Факеева, спецыяльна прысвечаная бібліяграфічным ведам як канчатковаму выніку бібліяграфіі. У ёй аўтар разглядае статус і тыпалагічныя асаблівасці бібліяграфічных ведаў. Апошнія ён падраздзяляе на асабовыя і сацыяльныя, прадметныя, кагнітаграфічныя і метадычныя; фактуальныя, дэскрыптыўныя, семіятычныя, гаворыць аб жыццёвых, навукова-эмпірычных і практычных бібліяграфічных ведах. Факееў выдзяляе не тры, а пяць узроўняў вынікаў бібліяграфіі:

1) веданне асобных бібліяграфічных фактаў;

2) тлумачальныя;

3) класіфікацыйныя;

4) бібліяграфічныя заканамернасці;

5) веды, якія ўтрымліваюцца ў прадпісанні да тэкстаў суб'екта бібліяграфічнага пазнання (гл.: Фокеев В.А. Природа библиографического знания: Монография/Рос. гос. б-ка.— М., 1995.— 352 с.)

Аналіз сучасных тэорый аб выніках бібліяграфіі дазваляе нам зрабіць выснову, што І.Сіманоўскі — адзін з першых у айчынным бібліяграфазнаўстве, хто інтуітыўна падышоў да разумення вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці як поліструктурнай, шмат'якаснай з'явы. Калі ўважліва прааналізаваць выказванні Сіманоўскага па гэтай праблеме, дык бачна, што ён, па сутнасці (паводле тэрміналогіі В.Факеева), вылучаў у структуры бібліяграфічных ведаў такія іх элементы, як прадметныя, кагнітаграфічныя і метадычныя. Аб плённасці вучэння І.Сіманоўскага сведчыць і тое, што Н.Сляднева, В.Факееў робяць спасылкі на яго працы. Метадычны статус бібліяграфіі, паслядоўным прыхільнікам якога быў І.Сіманоўскі, атрымаў глыбокую распрацоўку ў манаграфіі Н.Слядневай, а прадметны і кагнітаграфічны бакі вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці грунтоўна даследаваны В.Факеевым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ